+6 05

ПРОЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЕДНАЙЦЕСЯ!

Рабочніца і калгасніца Беларусі

№1

БССР
ЧНА

Дастойна сустрэнем XVIII Усесаюзную канферэнцыю ВКП(б)

Цэнтральны Камітэт Усесаюзнай Комуністычнай Партыі (большэвікоў) пастанавіў 15 лютага 1941 года склікаць XVIII Усесаюзную канферэнцыю ВКП(б). На парадку дня канферэнцыі пытанне аб рабоце партыйных арганізацый у галіне прамысловасці і транспарта і арганізацыйныя пытанні.

Паведамленне ЦК ВКП(б) аб скліканні канферэнцыі працоўныя нашай краіны сустрэлі з велізарнейшым натхненнем. Слаўная традыцыя кожную падзею ў жыцці краіны і партыі сустракаць новымі вытворчымі падарункамі глыбока ўкаранілася ў свядомасці народных мас. Вось чаму соцыялістычнае спаборніцтва імені XVIII партыйнай канферэнцыі прыняло асабліва вялікі размах.

Рабочыя, работніцы, інжынерна-тэхнічны персанал, калгаснікі і калгасніцы бяруць на сябе канкрэтныя абавязацельствы: падняць яшчэ вышэй прадукцыйнасць працы, даць краіне яшчэ больш высокаякаснай прадукцыі,—сустрэць XVIII Усесаюзную партыйную канферэнцыю перавыкананнем плана на заводах, фабрыках, у цэхах і агрэгатах.

Колькі патрыятычнага пачуцця ўкладзена ў гэты выдатны рух, у імкненне зрабіць краіну соцыялізма яшчэ больш багатай, яшчэ больш магутнай. З якой сілай гучыць у кожным узятым абавязацельстве бязмежная любоў да нашай большэвіцкай партыі, да совецкага ўрада, да вялікага правадыра і друга таварыша Сталіна.

Працоўныя Беларускай Совецкай Соцыялістычнай рэспублікі, як і ўвесь народ Совецкага Саюза, жывуць цяпер адной думкай—сустрэць XVIII партыйную канферэнцыю новымі вытворчымі перамогамі. Працаваць чэсна, самааддана—свяшчэнны абавязак кожнага. Амаль усе прадпрыемствы БССР уключыліся ў соцыялістычнае спаборніцтва імені XVIII Усесаюзнай канферэнцыі ВКП(б).

На мітынгу фабрыкі «Комунарка», прысвечаным паведамленню аб скліканні XVIII Усесаюзнай партыйнай канферэнцыі, комсамольскі арганізатар—стаханаўка Ida Гарайс заявіла ад імені ўсіх комсамольцаў, што яны бяруць на сябе абавязацельства ў чэсць XVIII партканферэнцыі даваць паўтары нормы ў дзень. Калектыў гэтай фабрыкі ўзяў на сябе абавязацельства выпусціць звыш плана ў першым квартале 200 тон прадукцыі на 375 тысяч рублёў.

Рабочыя і служачыя швейнай фабрыкі «Комінтэрн» (гор. Гомель) у чэсць партыйнай канферэнцыі абавязаліся выпусціць звыш плана на 210 тысяч рублёў прадукцыі. Калектыў шкловавода імені Сталіна (гор. Гомель) абавязаўся да дня адкрыцця партыйнай канферэнцыі выпусціць 7 тысяч квадратных метраў шкла, па паліроўцы шкла выканаць план на 110 процантаў, знізіць сабекошт на 10 процантаў, павысіць прадукцыйнасць працы на 5 процантаў.

Соцыялістычныя абавязацельствы ўжо многімі калектывамі, работніцамі і рабочымі з чэсцю выконваюцца. Так скурабутковы трэст заходніх абласцей БССР да 29 снежня 1940 года выканаў гадавы план. Калектыў рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікаў і служачых запалкавай фабрыкі імені 17 верасня (гор. Пінск) яшчэ 21 снежня выканаў гадавую вытворчую праграму па выпуску запалак. Стаханаўкі панчошна-трыкатажнай фабрыкі імені Клары Цэткін (гор. Віцебск) Ліда Вараб'ёва і Геня Рэйман 29 снежня на пяці насочных машынах, замест трох, устанавілі ўсесаюзны рэкорд вязкі мужчынскіх наскоў: за змену выпрацавалі 400 пар кожная, пры норме 293 пары.

За годы Сталінскіх пяцігодак нашы заводы і фабрыкі ўзбагаціліся перадавой сусветнай тэхнікай. Выраслі людзі, авалодаўшыя складанейшай тэхнікай вытворчасці. Ударніцтва, стаханаўскі рух, многастаночніцтва і сумяшчэнне прафесій сталі масавым з'явішчам у нашай рэспубліцы.

Мерапрыемствы партыі і ўрада ў галіне ўмацавання працоўнай дысцыпліны, узняцця прадукцыйнасці працы, павышэння якасці выпускаемай прадукцыі забяспечылі шырачэзную магчымасць павялічыць выпуск прадукцыі ў некалькі разоў.

Жыццё паказала, дзе па-большэвіцку змагаюцца за ажыццяўленне ўказаў Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня і 10 ліпеня, там канчаткова зжыты выпадкі прагулаў і спазненняў, палепшылася якасць і сортнасць прадукцыі і з дня ў дзень не толькі выконваюць, але і перавыконваюць вытворчыя планы. Такіх прадпрыемстваў большасць.

Усё-ж яшчэ ёсць частка заводаў і фабрык, якія не змагаюцца за дакладнае і поўнае ажыццяўленне задач, якія стаяць перад імі.

Нядаўна адбыўся пленум ЦК КП(б)Б, які заслухаў даклад сакратара Мінскага гаркома КП(б)Б тав. Власава аб кіраўніцтве прамысловасцю. Пленум адзначыў рад істотных недахопаў на прадпрыемствах горада Мінска. Асноўныя з іх—гэта адставанне некаторых прадпрыемстваў у выкананні дзяржаўных планаў, наяўнасць вялікай колькасці браку, перавыдаткаванне паліва і фондаў заработнай платы, грубае парушэнне тэхналагічных працэсаў і інш.

«Пленум ЦК КП(б)Б патрабуе ад гаркома, райкомаў КП(б)Б і ўсіх пярвічных арганізацый, каб яны глыбей унікалі ў эканоміку, у сутнасць работы прадпрыемства, поўнасцю скарыстоўвалі прадастаўленае пярвічным партыйным арганізацыям рашэннем XVIII З'езда ВКП(б) права кантролю над дзейнасцю адміністрацыі прадпрыемства, накіроўваючы ўсю партыйна-палітычную работу на барацьбу за паспяховае выкананне вытворчых планаў, усямернага разгортвання соцыялістычнага спаборніцтва, унядрэння стаханаўскіх метадаў працы».

Гэтыя ўказанні пленума павінны стаць баявой праграмай для партыйных арганізацый і кіраўнікоў прадпрыемстваў у іх рабоце. Работніцы, рабочыя, калгаснікі і калгасніцы, дастойна сустрэнем XVIII Усесаюзную партыйную канферэнцыю,—памножым рады стаханаўцаў, дадзім краіне мноства прадукцыі высокай якасці.

РАБОТНІЦА І КАЛГАСНІЦА БЕЛАРУСІ. ВЫДАННЕ ЦК КП(б)Б. № 1. СТУДЗЕНЬ 1941 г.

На вокладцы: Выдатніца вучобы трэцяга класа, 7 польскай школы горада Брэста Міра Ерундох у гарадскім Доме піонераў выконвае польскі народны танец. Фото В. Лупейка (БЕЛТА).

Зок-1/1844

Да новых яшчэ большых перамог

Прайшоў 1940 год. Два розных вынікі падводзяцца яму. Разгарэўшаяся імперыялістычная вайна, сотні тысяч забітых і раненых, сотні тысяч сірот, мільёны людзей, пазбаўленых прытулку, усё ўзрастаючыя голад і нішчата працоўных, ўсё ўзрастаючыя даходы капіталістаў ад крывавай бойні—такі вынік прайшоўшага года ў капіталістычных краінах. Мудрая Сталінская палітыка міра, далейшае ўмацаванне сваёй магутнасці, новыя поспехі ў прамысловасці, транспарце і сельскай гаспадарцы, умацаванне абароназдольнасці, рост заможнасці працоўных мас—такі вынік прайшоўшага года ў Краіне Соцыялізма.

Успомнім толькі некаторыя падзеі, якія адбыліся ў нас ў 1940 годзе. Вялікая совецкая краіна была ўцягнута ў вайну фінскай белагвардзейшчынай, якая хацела нарушыць безапаснасць нашых паўночна-заходніх граніц і пасягала на горад Леніна.

У жорсткіх баях з белафінамі доблесная Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія гераічна забяспечыла безапаснасць паўночна-заходніх граніц. Яна паказала ўсяму свету, што гатова ў любы момант і ў любых умовах разграміць ворага, які пасмее напасці на адзіную ў свеце Краіну Соцыялізма.

Дзякуючы мудрай палітыцы совецкага ўрада наша краіна пашырыла сваю тэрыторыю. 23 мільёны новых совецкіх грамадзян уліліся ў шчаслівую сям'ю народаў Совецкага Саюза.

Доўгія годы латвійскі, літоўскі і эстонскі народы стагналі пад ботам прыгнятальнікаў. У гістарычным 1940 годзе рабочыя, сяляне і працоўная інтэлігенцыя гэтых краін назаўсёды прагналі са сваёй зямлі эксплаататараў. Прыбалтыка стала совецкай. Літва, Латвія і Эстонія прыняты ў Вялікі Саюз Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік.

Працоўныя гэтых рэспублік перажываюць зараз выключна радасныя дні. Яны рыхтуюцца да вялікага свята—дня выбараў у Вярхоўны Совет СССР. На аснове вялікай Сталінскай Канстытуцыі будуць выбіраць сапраўдных народных дэпутатаў і аддадуць свае галасы за непераможны Сталінскі блок комуністаў і беспартыйных.

Румынскія бандыты ў свой час захапілі ў Совецкага Саюза Бесарабію. Дзесяткі год працоўныя жорстка эксплаатаваліся памешчыкамі і баярамі. У знамянальным 1940 годзе Бесарабія і Паўночная Букавіна звернута Совецкаму Саюзу.

Мінулы год быў годам небывалага вытворчага ўздыму працоўных СССР. Няўхільнае выкананне Указаў Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня і 10 ліпеня дало бліскучыя рэзультаты ў выкананні гаспадарчага плана і ўмацаванні абароназдольнасці нашай радзімы.

Узброены рашэннямі партыі і ўрада беларускі народ разам з усім совецкім народам дабіўся вялікіх поспехаў у рабоце. Павялічыўся выпуск прадукцыі, палепшылася яе якасць. На прадпрыемствах выраслі новыя стаханаўцы і ўдарнікі. Пашырыліся многастаночны рух і сумяшчэнне прафесій. Рэзультатам гэтага з'яўляецца тое, што многія фабрыкі і заводы датэрмінова выканалі гадавое вытворчае заданне.

Рабочыя, калгаснікі і працоўная інтэлігенцыя нашай рэспублікі, як і ўвесь совецкі народ, рыхтуюцца дастойна сустрэць XVIII Усесаюзную партыйную канферэнцыю. Яны змагаюцца за тое, каб адзначыць гэта вялікае свята яшчэ большымі дасягненнямі.

Мінулы год прынёс нямала перамог і ў соцыялістычнай сельскай гаспадарцы. Калгаснае сялянства атрымала высокі сталінскі ўраджай. Выросла заможнасць калгасных мас, павысіўся іх культурны ўзровень. Нядрэнных поспехаў калгасы дабіліся і ў развіцці соцыялістычнай жывёлагадоўлі.

Лепшыя калгасы і соўгасы, калгаснікі і калгасніцы заваявалі пачотнае права ўдзельнічаць ва Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы. Віднае месца на выстаўцы занялі жанчыны нашай рэспублікі.

Вось некаторыя з іх. Екацерына Герасімаўна Чарнецкая—даярка фермы калгаса імені Куйбышэва, Бабруйскага раёна, узнагароджана Вялікай залатой медаллю. Ачкуляс Пелагея Дзімітраўна—цялятніца соўгаса імені Горкага, Гомельскага раёна, узнагароджана Вялікай залатой медаллю. Тав. Сурда—звеннявая па ільну калгаса «Энергія», Ельскага раёна, узнагароджана Малой залатой медаллю і многа іншых Галоўвыстаўкомам узнагароджаны.

Уступаючы ў новы гаспадарчы 1941 год, совецкі народ добра памятае, што на дасягнутых поспехах нельга заспакойвацца. Ён будзе змагацца за яшчэ лепшыя поспехі, множыць багацці сваёй радзімы, мацаваць абароназдольнасць Краіны Соцыялізма.

Працоўныя жанчыны Совецкай Беларусі будуць і надалей у перадавых радах у барацьбе за выкананне задач, пастаўленых партыяй і ўрадам.

Совецкі Саюз праводзіць мудрую Сталінскую палітыку міра і нейтралітэта. Але наша Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія пільна стаіць на варце Кастрычніцкіх заваёў. Яна надзейна ахоўвае мірную працу народаў СССР і ў любы момант гатова разграміць ворага, адкуль-бы ён не з'явіўся.

У новым 1941 годзе 193-мільённы совецкі народ, згуртаваны вакол партыі Леніна—Сталіна, пойдзе ўперад да комунізма.

Жыццё і творчасць

Памятны год

Мне хочацца ўспомніць аб памятных днях у мінулым годзе. Першай знамянальнай датай было 24 сакавіка, калі працоўныя Кобрынскай выбарчай акругі абралі мяне дэпутатам Вярхоўнага Совета СССР.

Некалькі разоў была я ў сталіцы Совецкага Саюза—Маскве. Разам з членамі ўрада ў Крэмлі ўдзельнічала ў рабоце VI і VII Сесій Вярхоўнага Совета.

Калі ехала на Сесію ў Маскву, выбаршчыкі прасілі мяне перадаць таварышу Сталіну вялікую ўдзячнасць за шчаслівае жыццё.

Да мяне звяртаюцца выбаршчыкі з рознымі пытаннямі. Я заўсёды стараюся даць ім чоткі і ясны адказ. Многадзетныя маці Уліта Рэпеня, Палагея Жыльман, Хрысціна Анціпаровіч звярнуліся да мяне са скаргай, што ім затрымліваюць выдачу дапамогі па многадзетнасці. Высветліла прычыну затрымкі пры афармленні дакументаў. Пасля майго ўмяшацельства маці атрымалі грошы.

Вось другі прыклад. Калгаснікі калгаса імені Варашылава, Жабінскага раёна, папрасілі мяне аказаць ім дапамогу ў адкрыцці магазіна ў калгасе. Я занялася гэтым пытаннем. Праз некаторы час спажыўсаюз даставіў у калгас вялікую колькасць промтавараў. Калгаснікі набылі сабе вопратку і абутак.

Такіх прыкладаў можна прывесці многа. Клопаты партыі і ўрада аб палепшанні матэрыяльнага добрабыту і культурным росце працоўных—вялікія. Працоўныя на справе бачаць, што совецкая ўлада стварыла для іх самыя лепшыя ўмовы для работы і вучобы.

Юхімук Софія Несцераўна,
Дэпутат Вярхоўнага
Совета СССР.
Брэсцкая вобласць.

Не застановімся на дасягнутым

Прайшоўшы год прынёс многа шчасця і радасці вялікаму працоўнаму народу нашай краіны. Для мяне ён быў выключна радасным. У 1940 годзе мне прышлося пабываць у цудоўнай сталіцы—Маскве на Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы. Там я ўбачыла велізарныя дасягненні соцыялістычнай сельскай гаспадаркі, якіх дабілася калгаснае сялянства пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі. Уважліва агледзела ўсе павільёны. Асабліва мяне цікавіў павільён механізацыі, дзе маюцца машыны і нашага завода «Гомсельмаш».

У апошні час па ўсёй краіне стаханаўцы сталі абслугоўваць па некалькі станкоў. Сярод некаторых рабочых на нашым заводзе існавала думка, што на такарных станках нельга ўнядрыць многастаночны метад працы. Мне ўдалося даказаць ілжывасць такой думкі. Я пачала працаваць на двух такарных станках. Давала за змену 700—800 дэталей, замест норм—350. Па прыездзе з Масквы з выстаўкі перайшла на абслугоўванне трох станкоў. Рыхтуючыся да дастойнай сустрэчы XVIII Партыйнай канферэнцыі, зараз выконваю план на 460—500 процантаў.

Многа ўвагі ўдзяляю абаронна-фізкультурнай рабоце. У 1938 годзе ў спаборніцтве па бегу заняла першае месца, атрымала прыз—бюст Кірава. У мінулым годзе таксама заняла першае месца па лёгкай атлетыцы. Маю чатыры абаронныя значкі.

Новы 1941 год прынясе мне, як і ўсяму многамільённаму совецкаму народу, новыя поспехі ў рабоце, новыя поспехі ў асваенні навейшай тэхнікі, у перавыкананні плана.

А. Н. Петракова
Гомель.



Александра Нікіфараўна Петракова, токар механічнага цэха, комсамолка, стаханаўка-многастаночніца (Гомель, „Гомсельмаш").

На карысць радзімы

РАДАСНА ЖЫЦЬ І ПРАЦАВАЦЬ

У панскай Польшчы я прымала ўдзел у рэволюцыйным руху, працавала падпольна ў Маладзечна, Глыбокім, Смаргоні,

Кабыльніках, за што польская ахранка неаднаразова арыштоўвала мяне.

19 верасня 1939 года гераічная Чырвоная Армія вызваліла мяне з польскай турмы. Пасля гэтага я прыехала ў горад Смаргонь. Тут працавала сакратаром сялянскага камітэта. З сакавіка месяца 1940 года працую інструктарам райвыканкома. Работа мая адказная. Я стараюся яе выканаць як найлепш. Праводжу работу сярод сялян, мабілізую іх на выкананне задач. Таксама працую з сельскім актывам.

Была паслана на курсы старшынь сельсоветаў у горад Глыбокае. Там я паглыбіла свае веды. Скончыла курсы на выдатна. Цяпер таксама павышаю свой палітычны і культурны ўзровень. Вывучаю «Кароткі курс гісторыі ВКП(б)», чытаю газеты, журналы.

Працоўныя абралі мяне дэпутатам Вілейскага абласнога Совета дэпутатаў працоўных. Аддам усе свае веды і здольнасці на блага свайго народа.

А. К. Счастная, інструктар Смаргоньскага райсовета дэпутатаў працоўных Вілейскай вобласці.

РАБОТА НАТХНЯЕ

У кінематаграфію я прышла вучаніцай-мантажніцай. Увесь час з выключнай любоўю адносілася і адношуся да сваёй работы.

Прайшоўшы 1940 год прынёс мне многа новага, цікавага, радаснага. За гэты год я значна выросла і зрабіла свае першыя, праўда яшчэ робкія творчыя шагі.

Працуючы ў апошні час асістэнтам кіно-рэжысёра маёй заветнай марай было атрымаць самастойную работу. Гэта мара збылася. Мне была даручана самастойная работа па мантажу кіно-журналаў. Асаблівае задавальненне адчувала, калі мне ўдалося ўсебакова і поўна вырашыць тэмы асобных сюжэтаў. З даручанай работай справілася, змантыраваныя мной кіно-журналы атрымалі добрую ацэнку.

У 1941 годзе хочацца працаваць лепш, больш прадукцыйна.

Д. Турэцкая

Мінск.



Асістэнт рэжысёра Мінскай студыі кінохронікі комсамолка Д. Е. Турэцкая за мантажом чарговага нумара кіножурнала. Фото М. Савіна (Фотахроніка Белта).

На кіруючай пасадзе

Ужо больш года як я з'яўляюся старшынёй заводскага камітэта на фанерным заводзе. Работа мая вельмі цікавая і адказная. Працую з масамі і вучуся ў іх. На нашым заводзе працуе 720 чалавек. Рабочыя прымалі актыўны ўдзел у прадвыбарчай кампаніі. Некаторыя з іх былі старшынямі, членамі ўчастковых выбарчых камісій, агітатарамі.

З рабочага калектыва выбрана 12 чалавек у дэпутаты гарадскога Совета, з іх 8 жанчын. Лепшая стаханаўка, зменны майстар Марыя Астроўская выбрана дэпутатам абласнога Совета.

На кіруючай рабоце на заводзе 58 чалавек, з іх 17 жанчын. Дзве работніцы працуюць зменнымі майстрамі. Работніца планавага аддзела Мелання Клінкевіч скончыла курсы і цяпер працуе загадчыкам тарыфна-нарміровачнага бюро. З работай спраўляецца добра. На адказнай рабоце ў нас многа жанчын.

Карпенюк, старшыня заводскага камітэта.

г. Гродна.

ДА ЗЗЯЮЧЫХ ВЯРШЫНЬ НАВУКІ

І так пражыт яшчэ адзін год, год напружанай работы над кандыдацкім мінімумам, год своечасовага і паспяховага выканання індывідуальных аспіранцкіх планаў. Што было самае цікавае і самае выдатнае ў маім жыцці ў прайшоўшым годзе? Адказаць на такое пытанне надзвычай цяжка. Мне здаецца, што ўсё было цікавым і выдатным, бо мая любімая работа над вывучэннем беларускай літаратуры захапляе мяне з кожным днём усё больш і больш.

Тав. Бірукова.

У 1933 годзе я паступіла на літаратурны факультэт Мінскага педінстытута. Маёй радасці не было канца, бо перада мной, вясковай дзяўчынай, адчыніліся дзверы да зззяючых вяршынь навукі, ды яшчэ такой цудоўнай навукі, як беларуская і руская літаратура.

З вялікай зацікаўленасцю вывучала я творы асновапаложнікаў марксізма-ленінізма, чытала творы рускіх, беларускіх і заходне-еўрапейскіх класікаў літаратуры, вывучала крытычную літаратурную спадчыну. Асабліва цікавіў мяне рэволюцыйна-дэмакратычны напрамак рускай, беларускай і украінскай літаратуры, каб усё жыццё працаваць у гэтай галіне. Працуючы ў школе старалася знаходзіць вольны час, каб рыхтавацца да экзаменаў у аспірантуру. Нарэшце збылася мая мара. Я вытрымала экзамен і была залічана аспіранткай Мінскага педінстытута па беларускай літаратуры.

Новы 1941 год застае мяне ў канцы II курса аспірантуры. Самым цікавым момантам маёй аспіранцкай вучобы ў прайшоўшым годзе была работа над творчасцю Я. Коласа. З дзіцячых год захапляюся цудоўнымі творамі Я. Коласа. Высокая мастацкасць, глыбокая лірычнасць, выдатныя малюнкі беларускай прыроды, мілагучнасць вершаў захапляюць мяне ўсё больш і больш. Вось чаму я рашыла працаваць у аспірантуры над творчасцю Коласа. Праз два месяцы я здаю ўвесь кандыдацкі мінімум і прыступаю к рабоце над дысертацыяй на тэму: «Лірыка Я. Коласа». Вось гэта тое галоўнае, над чым я буду працаваць у новым годзе, вось гэта тое новае і захапляючае, што чакае мяне і аб чым узнікаюць зараз такія светлыя мары і лятуценні.

К канцу 1941 года я збіраюся закончыць дысертацыю, каб укласціся ў прадастаўленыя дзяржавай тэрміны і своечасова скончыць аспірантуру.

Думкі аб дысертацыі зараз не пакідаюць мяне ні на мінуту. І гэта з'яўляецца маёй лепшай марай, маім жыццёвым дзяржаўным планам на надыходзячы новы год.

Ж. Бірукова, аспірантка Педінстытута.

Мая мара

Уступаючы ў новы год кожны тружанік нашай краіны падводзіць вынікі праробленай работы за ўвесь прайшоўшы перыяд.

Для мяне 1940 год быў годам упартай і напружанай работы. Мне патрэбна было выканаць адказнае заданне—напісаць да Усебеларускай выстаўкі «Ленін і Сталін—арганізатары БССР» карціну на тэму «Акупанты». Карціну напісала, але пазбегнуць памылак не ўдалося. Гэта даказвае, што я яшчэ недастаткова ўладаю малюнкам.

Надыходзячы новы 1941 год для мяне павінен быць яшчэ больш напружаным, пладатворным, каб у будучай рабоце пазбегнуць недахопаў.

Да 25-годдзя Совецкай улады ў Маскве адкрываецца Усесаюзная выстаўка «Радзіма», у якой беларускія пісьменнікі будуць прымаць непасрэдны ўдзел. Мая сакравеннейшая мара—напісаць для гэтай выстаўкі карціну, дастойную маёй вялікай радзімы. Каб дабіцца гэтага буду многа і ўпарта працаваць над павышэннем сваіх прафесіянальных і палітычных ведаў.

А. Г. Дакальская, мастак.
Мінск.

На блага радзімы

Нямала перанесла я гнёту, нішчаты і бяспраўя пры панаванні польскіх прыгнятальнікаў. З кожным днём расла мая нянавісць да іх. Ведала, што звергнуць уладу эксплаататараў можна толькі шляхам барацьбы. Я прымала ўдзел у рэволюцыйным руху. Арганізоўвала гурткі моладзі, у якіх чыталі нелегальную літаратуру, за што польская ахранка на кожным кроку праследвала мяне.

Толькі пры совецкай уладзе працоўныя атрымалі радаснае і шчаслівае жыццё. Цяпер я працую настаўніцай няпоўнай сярэдняй школы № 13. Сваю работу спалучаю з вучобай. Завочна займаюся ў Мінскім педагагічным інстытуце на гістарычным факультэце. Павышаю свой ідэйна-палітычны ўзровень. Ужо вывучыла і заканспектыравала «Кароткі курс гісторыі ВКП(б)». Цяпер працую над першакрыніцамі марксізма-ленінізма. Гаркам партыі вылучыў мяне пазаштатным агітатарам і лектарам па антырэлігійнай прапагандзе. Гэту работу вельмі люблю і выконваю яе з вялікім задавальненнем.

Эрліх-Муравец

г. Брэст.

Будзем змагацца за высокі ўраджай

Кожнаму чалавеку хочацца ўспомніць пройдзены год знамянальнымі перамогамі, заваёвамі вялікай радзімы і выдатнымі поспехамі ў сваім асабістым жыцці.

Для мяне прайшоўшы год быў годам упартай працы і вялікай грамадскай дзейнасці. Я працую старшынёй калгаса. Яшчэ ў пачатку года мы паставілі перад сабой задачу—дабіцца высокага ўраджаю збожжа. Усе калгаснікі ўзяліся за добрую апрацоўку глебы. Увосень мы ўзаралі глебу на зіму. Ранняй вясной апрацавалі яе і пасеялі збожжа. Калі з'явіліся ўсходы, наладзілі за імі догляд.

У выніку нашай добрасумленнай працы мы атрымалі зернавых 13 цэнтнераў з гектара і 1200 пудоў бульбы. Поўнасцю засыпалі насенныя і страхавыя фонды, ачысцілі насенне.

У працэсе работы ў калгасе выраслі людзі—змагары за высокі ўраджай: Марыя Дудкевіч, Зінаіда Лугоўская, Тацьяна Шпакоўская. Яны сістэматычна выходзілі на работу і працавалі чэсна.

На будучы год мы намецілі дадаткова скарыстаць усе свабодныя нераспрацаваныя кавалкі зямлі ў мэтах атрымання большага ўраджаю збожжа. Мы спадзяемся з кожнага гектара атрымаць не менш 16 цэнтнераў.

Свае абавязацельствы на 1941 год мы выканаем. З усёй настойлівасцю будзем змагацца за высокі ўраджай.

Паўліна Сенчыло,
старшыня калгаса.

Талочынскі раён,
калгас „МОПР"

Клопаты аб здароўі працоўных

Я абрана дэпутатам Вілейскага гарадскога Совета дэпутатаў працоўных. Такі пачот выпаў на маю долю першы раз у жыцці. Работу дэпутата пастараюся выконваць добрасумленна. Усе свае сілы і веды аддам для ўмацавання нашай соцыялістычнай дзяржавы.

За час совецкай улады ў горадзе Вілейка зроблена вельмі многа па палепшанні медыцынскай дапамогі працоўным. Праводзіцца таксама прафілактычная работа сярод насельніцтва. Пашыраны паліклініка і кансультацыі. Пабудавана новая бальніца.

Але яшчэ многа застаецца зрабіць для поўнага ўдаскаканалення лекавых установ, давядзення іх да ўзроўню лекавых устаноў усходніх абласцей нашай рэспублікі.

Як дэпутат гарадскога Совета я прыкладу ўсе намаганні для яшчэ большага ўмацавання і развіцця аховы здароўя працоўных.

Баршчэўская-Перэльман,
г. Вілейка. Урач-тэрапеўт.

Перадавыя рабочыя і работніцы Рыгі ўступілі ў рабочую гвардзію і нясуць ахову прадпрыемстваў соцыялістычнай прамысловасці Латвіі.
На здымку: Рабочагвардзейцы Эльза Мажэік (злева) і Эльвіра Страўпе.
Фото Д. Чэрнова. (Фото ТАСС).

У Сухумі ва ўсесаюзнай селекцыйнай станцыі вільготных і субтрапічных культур вырашчваецца багацейшая калекцыя цытрусавых пладовых дрэў, якая налічвае да 700 рознавіднасцей. На здымку: Збор высокасортных апельсінаў „Вашынгтон-Навель" для ўсесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі 1941 г. На першым плане—зборшчыца А. І. Сошына. Фото В. Малышэва. (Фота ТАСС).

За выдатныя поспехі ў вучобе

Нельга пахваліцца вынікамі работы школ за першае паўгоддзе па Сталінскаму раёну горада Мінска. Ва ўсіх школах знізілася паспяховасць вучняў у параўнанні з першай чвэрцю. Непаспяховасць вучняў галоўным чынам падае на рускую, беларускую мовы і матэматыку.

Вывучэнне прычын непаспяховасці паказала, што адставанне рэбят па вучобе і дрэнная дысцыпліна падае на тыя класы і тых вучняў, дзе з боку педагога няма правільнай арганізацыі ўрока і кантроля за работай вучняў, дзе класны кіраўнік недастаткова правярае і аказвае дапамогу ў падрыхтоўцы хатніх заданняў вучням. Адной з важнейшых прычын адставання ў вучобе з'яўляецца слабая сувязь школы з бацькамі і адсутнасць нагляду з боку бацькоў за вучобай сваіх дзяцей.

Прывядзем некалькі фактаў дадатнага і адмоўнага характару. Настаўніца матэматыкі і класны кіраўнік 5 класа 2-й сярэдняй школы Стыся Маркаўна Фурман сістэматычна штодзённа сочыць за выкананнем хатніх заданняў сваімі вучнямі. Аказвае дапамогу адстаючым, трымае цесную сувязь не толькі з бацькамі вучняў класа, дзе яна з'яўляецца класным кіраўніком, але і з бацькамі вучняў тых класаў, дзе яна выкладае матэматыку. Стысю Маркаўну мы бачым у класах задоўга да пачатку заняткаў. Яна сустракае вучняў, гутарыць з кожным з іх, даведваецца ці выканана хатняе заданне і калі не, то даведваецца аб прычынах, аказвае дапамогу, а ў выпадку неабходнасці звязваецца з бацькамі. У такім класе, у такога класнага кіраўніка рэбяты паспяваюць, працуюць. Вучань, які не падрыхтаваў урокаў у яе класе, або па яе прадмету адчувае сябе слабым, заўсёды стараецца прыйсці падрыхтаваным.

Зусім іншае мы наглядаем у пятым класе «Б», дзе класны кіраўнік т. Цукерман. Вучні гэтага класа хатніх заданняў зусім не выконваюць, атрымаць дрэнную адзнаку для іх нічога не значыць. Іх ніхто не спытае аб гэтым і не давядзе да ведама бацькоў, загадчыка вучэбнай часткі, дырэктара школы. Адсюль і паспяховасць пятага класа «Б» у пачатку снежня раўнялася 15 проц.

Настаўніца рускай мовы ў пятых класах гэтай-жа школы Фінкель за выкананнем хатніх заданняў вучняў не сочыць. За ўвесь час работы ні аднаго сшытка з заданнямі не выправіла. Ні адных заняткаў з адстаючымі вучнямі, ні адной кансультацыі для гэтых вучняў не правяла. У пятым класе, дзе яна выкладае рускую мову, з дваццаці сямі вучняў не паспявае—дваццаць тры. Сшыткі ў вучняў брудныя, без палёў. Хатнія заданні выконваюцца неахайна і то толькі паасобнымі вучнямі. Пры праверцы кантрольных работ па рускай мове высветлілася, што тав. Фінкель сама неахайна выпраўляе сшыткі. У работах 13 вучняў не выпраўлена 22 грубых памылкі. Акрамя таго 21 памылка выпраўлена не настаўніцай, а відаць бацькамі. Такая «работа» педагога не можа забяспечыць высокай паспяховасці вучняў.

Паспяховасць вучняў залежыць таксама і ад той увагі, якая ўдзяляецца бацькамі самім дзецям. Такіх бацькоў у нас многа. Адным з лепшых прыкладаў можа служыць маці вучняў 47 школы Макушок. Яна цікавіцца вучобай сваіх дзяцей, іх дысцыплінай. Яе ведаюць усе настаўнікі і большасць бацькоў. Тав. Макушок цікавіцца не толькі паспяховасцю сваіх дзяцей—выдатнікаў вучобы, але і паспяховасцю астатніх вучняў школы.

Тав. Макушок пабывала ў некаторых бацькоў, дзеці якіх не паспяваюць. Яна сваёй настойлівасцю дабілася таго, што многія бацькі таксама пачалі сачыць за сваімі дзецьмі і падцягнулі іх паспяховасць.

Ёсць яшчэ многа бацькоў, якія не цікавяцца паспяховасцю сваіх дзяцей. Яны не бываюць ніколі ў школе, не сочаць за тым, як іх дзеці рыхтуюць урокі, дзе і як праводзяць вольны ад вучобы час. Адсюль і другагодніцтва і дэзарганізатары.

Науменка, інспектар Сталінскага раёна.

Мінск.



Будынак дзіцячага сада на 150 месц у калгасе імені Варашылава, Супрасльскага сельсовета, Беластоцкага раёна.
Фота А. Сапіра (Фотахроніка БЕЛТА).

ГАТОВЫ да працы і абароны

Калі Галіне Латушко прапанавалі запісацца ў фізкультурны гурток, яна доўга не згаджалася.

— Неяк сорамна,— гаварыла Галіна.—Там-жа трэба трусы надзяваць, будуць смяяцца...

Аднойчы ў выходны дзень фізкультурнікі завода выйшлі на спартыўную пляцоўку для трэніроўкі. Яны рыхтаваліся да лёгкаатлетычных спаборніцтваў. Сюды прышла і Галіна. Нібы жартуючы, яна стала на бегавую дарожку. Пяць дзяўчат разам з Галінай падыйшлі да лініі старта. Падалі каманду. Праз некалькі секунд першай у фініша была Галіна.

— Маладзец,—хвалілі яе прысутныя.—А ты саромілася, не хацела ісці,—заўважалі падругі.

Маладая, энергічная дзяўчына была задаволена сваім поспехам.

Так было два годы таму назад, калі Галіна ўпершыню прышла з калгаса на завод. Цяпер Галіна Латушко мае тры абаронныя значкі: Гатоў да працы і абароны, проціпаветранай і хімічнай абароны, Гатоў да санітарнай абароны і рыхтуецца да здачы норм на значок Гатоў да працы і абароны другой ступені. Яна займаецца ў лёгкаатлетычнай секцыі добраахвотнага спартыўнага таварыства «Харчавік». Спорт стаў яе любімым заняткам.

На заводзе Галіна выросла не толькі, як фізкультурніца. Яна з'яўляецца брыгадзірам-стахановкай упаковачнага цэха, а пачынала працу ўпакоўшчыцай.

Многія дзяўчаты завода з вялікай любоўю і настойлівасцю авалодваюць фізкультурным спортам. Сакратар камітэта комсамола т. Катлова, работніца ўпаковачнага цэха Оля Нарчук, работніца дражджавога цэха Сабіна, супрацоўніца канторы Эсфір Розенберг і другія рыхтуюцца да здачы норм на значок Гатоў да працы і абароны. Актыўнымі ўдзельніцамі гарадскіх і рэспубліканскіх фізкультурных спаборніцтваў з'яўляюцца Арлова і Салянка.

Нядаўна адбыўся пешы пераход моладзі завода на 7 кіламетраў і тут дзяўчаты праявілі сябе, як дысцыплінаваныя і выносліваія фізкультурніцы.

Стаханаўкі дражджавога завода „Чырвоная зара" (Мінск) тт. Латушка (на пярэднім плане) і Салянка на лыжнай прагулцы. Фото І. Рабіновіча.

Фізкультурны калектыў завода па рабоце лічыцца лепшым у горадзе. І сапраўды гэта так. Планавае заданне падрыхтоўкі значкістаў ГТА ў мінулым годзе калектыў перавыканаў.

Удзельнічаючы ў кросе імені Шверніка, фізкультурная каманда завода заняла першае месца па гораду, за што атрымала грамату ад Беларускага совета добраахвотнага спартыўнага таварыства «Харчавік» і пераходны прыз—бюст Леніна.

Ва ўсебеларускіх лёгкаатлетычных спаборніцтвах і ў завочных усесаюзных спаборніцтвах па гранатамятанню калектыў заняў другое месца і таксама атрымаў грамату.

У гэтым годзе фізкультурны калектыў завода быў удзельнікам вясенняга кроса профсаюзаў, усебеларускага спаборніцтва лёгкаатлетыкаў і завочных гарадскіх спаборніцтваў па гранатамятанню. Усюды ён заняў першае і другое месцы.

Дзве лепшых фізкультурніцы калектыва Латушко і Арлова залічаны ў састаў зборнай каманды добраахвотнага спартыўнага таварыства «Харчавік», якая была ўдзельнікам усесаюзных лёгкаатлетычных спаборніцтваў.

Рэгулярна два разы ў тыдзень займаюцца секцыі па гранатамятанню, гімнастыцы, мото і лёгкай атлётыцы. Вялікую ўвагу фізкультурнай рабоце ўдзяляе камітэт комсамола. Ён дапамагае фізкультурнікам у правядзенні розных мерапрыемстваў. За добрую пастаноўку фізкультурнай работы на заводзе, нізавы калектыў многа разоў прэміраван.

У сучасны момант фізкультурнікі завода ўсю ўвагу ўдзяляюць лыжнаму спорту. Намечан план правядзення лыжных спаборніцтваў. Зараз ідзе трэніроўка. Былі праведзены два пешых пераходы. У інтэрнатах праводзяцца гутаркі аб значэнні прадстаячага Усесаюзнага лыжнага кроса профсаюзаў. Зроблен запіс удзельнікаў кроса. Уся падрыхтоўчая работа асвятляецца ў заводскай насценнай газеце.

Моладзь завода з вялікай любоўю авалодвае рознымі відамі фізкультурнага спорта. Яна рыхтуе з сябе фізічна-моцных, выносліваых, смелых, адважных байцоў, здольных, калі гэта спатрэбіцца стойка перанесці ўсякія цяжкасці ваеннага часу.

А. Фёдарава

Мінск.

Жили-были дед да баба. Было у них три сына—два умных, а третий Иванушка-дурачок. Старшие братья в поле работали, а Иванушка на печи лежал да орешки щелкал.

Вот раз баба и говорит Иванушке:

— Полно тебе, Иванушка, на печи лежать да орешки щелкать, надо отцу с матерью помочь. Старшие братья в поле работают, а ты поезжай-ка в город да купи все, что для дома надобно.

Поехал Иванушка в город, все сделал по-хорошему, всего закупил. Купил соли и сахару, и мяса, и ложек, и чашек, да еще и стол купил. Ну ладно, хорошо. Едет Ванюшка домой, а лошаденка неудалая—везет не везет, спотыкается. Тяжело ей, видно.

«А что,—думает Иванушка,—ведь у лошади четыре ноги да у стола четыре ноги—так стол и сам добежит».

Снял с телеги стол, поставил на дорогу, хлыстом стеганул:

— Догоняй!—говорит.

Едет Иванушка перелеском, вдоль дороги пеньки стоят обгорелые. Солнце их жжет, дождик мочит. Пожалел их Иванушка:

— Эх, ребятки, без шапок стоите, плохо вам, сердечные.

Вынул из ящика горшки, чугуны, сковороды да на пеньки обгорелые и надел:

— Вот вам, ребятки, шапочки!

Прач
РЭ

ИВАНУШКА Д

Русская казка

Доехал Иванушка до реки, давай лошадь поить. А лошадь не пьет.

— Что не пьешь? Может, вода не солона?

Взял Иванушка мешок соли, в реку высыпал. А лошадь все не пьет.

— Ишь ты, все ей вода не хороша. Ну ладно, дай подслащу.

Высыпал Иванушка в реку мешок сахару. А лошадь все не пьет. Рассердился Иванушка:

— Эка привередница, пошла прочь с моих глаз!

Да и прогнал лошадь хворостиной в лес.

Ост
только
мяса
Ивану
щил т

Воро
каркан
А И
Укра
Испу
— Д
Ну ва
лучше
Да
нам.
Идет
а лож
кают:
А

...чытайце РЭБЯТАМ

...КА ДУРАЧОК

...усская сказка

...еки, ло- ...жет, ...шок ло- ...не ...под- ...еку ...все ...лся ...ица, ...! ...кво-

Остались у Иванушки только ложки в мешке да мяса кусок на телеге. Взялся Иванушка за оглобли, потащил телегу.



Вороны над мясом вьются, каркают: «Кар-р! Кар-р!»

А Иванушке показалось:— «Украл! Украл!»

Испугался Иван-дурачок:

— Да не крал я, не крал! Ну вас совсем. Забирайте-ка лучше мясо!

Да и выкинул мясо воронам.

Идет Иванушка по дороге, а ложки в мешке так и бряк...ают: «Бряк, бряк, бряк!»

А ему кажется—ложки дразнятся: «Иван-дурак, Иван-дурак».

Рассердился Иванушка, бросил ложки на земь, ну их топтать да приговаривать:

— Вот вам Иван-дурак! Вот вам Иван-дурак! Будете дразниться, негодницы!

Вот пришел Иванушка домой. Баба его спрашивает:

— Все ли купил, Иванушка?

— Все, все, матушка.

— Да где ж у тебя покупки-то?

— Стол бежит, да, знать, поотстал маленько. Горшки да чугуны на ребят надел. Соль да сахар в реку высыпал. Мясо воронам отдал. Лошадь прочь прогнал. А ложки дразнятся, так я их на дороге кинул.

Заплакала баба:

— Ах, Иванушка, Иванушка, нахозяйничал, сынок! Сиди теперь дома, а я лошадь побегу искать. Пошел Иванушка в избу, дверь замкнул, на лавку сел. В бочке квас у печки бродит: «П-с-с—т, п-ш-т».

А Иванушка думает: «Пусти, пусти».

Взял втулку вынул да весь квас в избу и выпустил. Поплыли по квасу чашки, ложки, плошки. Поплыли скамьи да столы... А Иванушка в корыто сел, по избе разъезжает, лопатой направляет, песни поет.

Баба пришла, в дверь стучит. По избе квас журчит, а Иванушка покрикивает:

— От одного берега отъехал, до другого не доехал. Подожди, мать, до дверей доплыву—отомкну!

Ну что с ним сделаешь!

Азароныя шчасцем

— Вы зноў аб гэтым трубачысце, дайце спакою, не магу больш слухаць,—з гэтымі словамі гаспадар фабрыкі «Ардаль» устаў з-за стала і дэманстратыўна павярнуўся спіной да прасіцеляў. Потым ён падышоў да акна і пачаў барабаніць пальцамі па шыбах, даючы гэтым зразумець, што гутарка скончана і гаварыць яму больш няма аб чым.

Прасіцелі, іх было двое,—сівабародыя прадстаўнікі яўрэйскага дабрачыннага грамадства — надзелі свае футравыя шапкі і накіраваліся да дзвярэй. Да такога прыёма ім не прызвычайвацца. Амаль так іх сустрэла пяць буйных фабрыкантаў горада Ліды. Не хочуць больш дапамагаць. Справы дрэнныя. Застой з прадукцыяй. Крызіс.

— Ну, а што мы будзем рабіць?

— Тое, што і яны, пакажам рукой на дзверы, вымятайцеся, каб ні адной лішняй мінуты вас тут не было,—так рашылі паміж сабой дабрачынцы.

Гутарка ішла аб самай беднай сям'і ў Лідзе, аб мацеры адзінаццаці дзяцей, аб Ганчароўскай.

З болем у сэрцы бедная жанчына павінна была звярнуцца да міласці дабрачынцаў. Спачатку ёй не паверылі. Пышна апранутыя ў шоўкавыя плацці патранесы палахліва робячы кожны шаг, прышлі праверыць ці не абманваюць іх. Тое, што яны ўбачылі перавышала ўсякія чаканні. Дзеці «па чарзе» насілі свае некалькі патрапаных касцюмчыкаў. «Шчасліўцы» гулялі, а астатнія аставаліся дома ў ложку, бо ім не было чаго апрануць. Окны былі выбіты, дзверы пакасіліся.

Муж Ганчароўскай — трубачыст, выбіваўся з сіл, каб хоць як-небудзь забяспечыць сям'ю, але тых жалкіх грашоў, якія ён атрымліваў за ачыстку дымаходаў ледзь хапала на хлеб. Дзеці не вучыліся, дзічэлі і маці, абліваючыся слязьмі, да болю перажывала тое, што не можа дапамагчы ім.

Расчуленыя расказамі «Сердабольных патранес» мясцовыя дабрачынцы напярэдадні свята сабралі некалькі «злотых» для дзяцей беднякоў. К гэтаму часу над сям'ёй Ганчароўскіх пранеслася новае няшчасце. За няўплату кватэрных грошай іх выкінулі на вуліцу. Сям'я асталася пад адкрытым небам. Спалоханыя дзеці плакалі, а няшчаснай маці здавалася, што смерць для ўсіх будзе ратункам. На начлег сям'і ў 13 чалавек выдзялілі каморку ў двары сінагогі. Ведайце, моў, міласць божую, але тут толькі павялічыліся пакуты Ганчароўскіх.

Праз некалькі дзён у двары сінагогі можна было бачыць жудасны малюнак. З каморкі выносілі жалкі скарб Ганчароўскіх, складалі яго на дварэ, прымушаючы гэтым шукаць кватэру. І зноў змучаныя дзеці спалохана пыталіся ў маці, дзе яны сёння будуць начаваць. Колькі слёз каштавала дзецям і ўсёй сям'і Ганчароўскіх паказная «міласць» дабрачынцаў.

— Той не пазнаў сапраўднага гора, хто не хадзіў па «міласцях» усіх гэтых наскрозь фальшывых дабрачынных абшчын,—гаворыць тав. Ганчароўская, якая перажыла многа гора на сваім вяку.

Часта бацька расказваў дзецям.

— Горадам Ліда зараз кіруе 10 фабрыкантаў, пан бургамістр і паліцэйскі. Вы скажаце, што гэта несправядліва,—а дзе-ж астатнія людзі. Тое-ж самае і я гавару. Я гавару, што гэта не можа так прадаўжацца, я гавару, што працоўны чалавек нарэшце адчуе сябе гаспадаром і прымусіць слухаць яго. Вось убачыце, дзеці.

І дзеці верылі, таму што яны чулі гэта не толькі ад бацькі і маці, але і ад другіх працоўных.

... Гэта было на некалькі месяцаў пазней таго, як фабрычны горад Ліда стаў совецкім. Ганчароўскіх запрасілі ў горсовет. Старшыня выканкома Совета дэпутатаў працоўных Ефрэм Іванавіч Гладышэў—знатны беларускі дрэваапрацоўшчык цёпла прыняў бацькоў многадзетнай сям'і.

— Гарадскому совету вядома, ў якіх цяжкіх жыллёвых умовах жывеце вы. Хопіць мучыцца. У цэнтры горада аслабаніліся кватэры фабрыкантаў, займайце адну з іх.

— Ага,—лікуючы заявіў Ганчароўскі, падымаючыся з месца,—я заўсёды гаварыў, што ўсе гэтыя гаспадары «Ардалей» не доўга будуць карыстацца сваімі благамі, не маюць яны права на іх. Усё дабро нажыта працоўнымі і яно павінна належаць ім.

Гладышэў усміхнуўся:

— Правільна гаворыце, тав. Ганчароўскі.

... Калі дзеці ў першы раз увайшлі ў пакоі кватэры, якую ім перадаў горсовет, яны былі нерашучы і баязлівы. Ім не верылася, што кватэра, дзе яны застануцца жыць, будзе мець некалькі акон, такую высокую столь. Іх сумненні развеяла маці.

— Ну, дзеці, адчувайце сябе як дома, ды вы і ёсць дома.

Аб сям'і Ганчароўскіх я даведаўся на адным з заняткаў агітгуртка хатніх гаспадынь. Аб гэтай сям'і расказваў агітатар. Ён гаварыў проста і нават некалькі суха, але гэта быў пераканаўчы расказ аб тым, як перамагла справядлівасць, аб тым, як устанавілася новае жыццё на вызваленай зямлі.

Толькі ў совецкай Лідзе сям'я Ганчароўскіх атрымала ўсе правы і ўмовы для чалавечага існавання. З каморкі іх перасялілі ў новую кватэру. Сам Ганчароўскі кінуў прафесію трубачыста, якая яму была не па душы. У адной з совецкіх устаноў ён атрымаў новую работу. Дзеці больш не бегаюць па вуліцах у пошуках кавалка хлеба. Трое вучацца ў Рамесленым Вучылішчы, пяцера—у сярэдняй школе. Дома засталося толькі двое. Падрастуць і яны пойдуць вучыцца. Урад дапамагае Ганчароўскім выхоўваць дзяцей. Па многадзетнасці мацеры назначана дапамога ў 5 тысяч рублёў.

Так расказваў агітатар. З простых фактаў вырастаў выдатны малюнак новага жыцця, перамогшага і назаўсёды замацаваўшагася пад сцягам Саветаў.

Ліда. **Е. Садоўскі.**

ВЫДАТНЫ, НОВЫ ЗАВОД

Будынак завода рос на нашых вачах. Рос як у казцы, не па днях, а па часах... Удзень і ўначы, у мароз і непагоду самаддана працавалі будаўнікі.

Мы, рабочыя радыёзавода з любоўю сачылі, як узнімаліся карпусы, як аддзелваліся і мантыраваліся цэхі. Мы ведалі, як клалася кожная цэгла, а ўсё-ж, прышоўшы ў першы раз на завод, былі здзіўлены. Помню, як моцна білася сэрца, калі ўпершыню я ўвайшла ў велізарныя, светлыя, чыстыя залы. Ступаючы па паркетнай падлозе, адчувала сябе як у палацы—палацы радаснай свабоднай працы. Кожнае рабочае месца гаварыла аб тым, што завод будаваў рабочы клас—гаспадар, будаваў для сябе,—ва ўсім відаць клопаты аб чалавеку.

Думка мімаволі ідзе назад, у нядаўняе мінулае. Успамінаецца завод у былой Польшчы. Не, тут не можа быць ніякіх параўнанняў... Што можа быць агульнага ў нашага новага завода са злепкам карпусоў нахутка збітых павукамі-прадпрыемцамі з адзінай думкай, з адзінай мэтай—хутчэй напоўніць да адказа будынкі рабочымі, каб высмактаць як мага больш поту і крыві. Летам, у перапоўненым мантажным цэху завода пры раскаленых паяльніках можна было задыхнуцца. Працавалі там амаль выключна жанчыны і кожны дзень адзначаўся двума-трыма выпадкамі страты прытомнасці.

Завод наш па сваёй праектнай магутнасці займае ў СССР другое месца пасля завода „Электросигнал“ і з'яўляецца адным з самых буйных у Еўропе. На 1941 год перад заводам пастаўлена вялікая задача—мы павінны выпусціць за год 75 тысяч высокаякасных радыёпрыёмнікаў-супергетэродзін, акрамя таго—аўтамабільныя прыёмнікі, узмацніцелі, калгасныя ўстаноўкі.

Першы пускавы перыяд такога складанага прадпрыемства як радыёзавод—гэта вялікая крапатлівая работа па абучэнню кадраў. Азнаёміць рабочых, якія ўпершыню прышлі на завод з калгасаў ці са школьнай скам'і, з працэсам радыёвытворчасці—задача нялёгкая. Аднак з гэтай задачай наш завод паспяхова спраўляецца, аб чым сведчыць рост прадукцыйнасці працы.

Сустрэчу новага года завод азнамянаваў асваеннем праектнай магутнасці галоўнага канвеера ў зборачным цэху. 30 снежня праектная норма была выканана на 102 процанта. У гэты-ж день быў пушчан другі канвеер у зборачным цэху.

На заводзе вылучаюцца і растуць новыя людзі. Жанчыны, якія па некалькі год прапрацавалі на заводзе ў былой белапанскай Польшчы на адных і тых-жа працэсах без перспектывы вылучэння, на новым заводзе вылучаны брыгадзірамі-кантралёрамі. Яны паказалі, што выдатна ведаюць сваю справу, што хочуць і ўмеюць працаваць па-новаму, па-соцыялістычнаму. Тав. Тарно пастаўлена на чале брыгады катушачніц, яна выдатна вучыць людзей. Брыгада выконвае ўжо норму на 150—160 процантаў. Брыгадзір тав. Шэхтман з любоўю, клапатліва вучыць работніц дакладнай і складанай рабоце па зборцы дынамікаў.

Добра працуюць і абучаюць кадры і другія жанчыны-брыгадзіры. Для прыкладу можна ўзяць т. т. Прэнчык, Ружавіцкую, Шухман, Мілер, Вятроўскую.

Старыя кадравыя работніцы Дрэваапрацоўчага завода імені Молатава служаць прыкладам стаханаўскай работы і актыўнага ўдзелу ў грамадскім жыцці завода. Тав. Шэр, якая 10 год працавала на заводзе, выконвае норму на 160 процантаў. Яна неаднаразова была прэміравана за выдатную работу. Абрана ў склад цэхкома. Ёй даручана кіраўніцтва работай страхдэлегатаў. Тав. Шэр удава, выхоўвае двух сыноў. Ёй далі пуцёўку ў дом адпачынку для сына на зімнія канікулы.

Тав. Архімовіч з дрэваапрацоўчага цэха хутка асвоіла новую кваліфікацыю—паліроўшчыцы і выконвае норму на 130 процантаў. Яна таксама абрана членам цэхавага камітэта. Жанчыны-стаханаўкі вылучаны на профсаюзную работу.

Разам з ростам завода растуць людзі, расце прадукцыйнасць працы, паляпшаецца якасць прадукцыі. Разам з усім рабочым класам Вялікага Совецкага Саюза наш завод рыхтуецца да дастойнай сустрэчы XVIII Партканферэнцыі. Цэхі адзін за другім уключаюцца ў соцспаборніцтва, прымаючы канкрэтныя абавязацельствы. Абавязацельствы гэтыя будуць з гонарам выкананы.

В. Міхалеўская—работніца радыёзавода.

Мінск.



Лепшая стаханаўка штампоўшчыца мех-загатавіцельнага цэха радыёзавода імені Молатава (Мінск) тав. Жураўская Т. І., узнагароджаная граматай Вярхоўнага Совета БССР.

На здымку: тав. Жураўская за змазваннем машыны перад пачаткам работы.

Фота І. Рабіновіча.

А. Чехов

Зеркало

Подновогодний вечер. Нелли, молодая и хорошенькая дочь помещика-генерала, день и ночь мечтающая о замужестве, сидит у себя в комнате и утомленными, полузакрытыми глазами глядит в зеркало. Она бледна, напряжена и неподвижна, как зеркало.

Несуществующая, но видимая перспектива, похожая на узкий, бесконечный коридор, ряд бесчисленных свечей, отражение ее лица, рук, зеркальной рамы— все это давно уже заволоклось туманом и слилось в одно беспредельное, серое море. Море колеблется, мигает, изредка вспыхивает заревом...

Глядя на неподвижные глаза и открытый рот Нелли, трудно понять, спит она или бодрствует, но тем не менее она видит. Сначала видит она только улыбку и мягкое, полное прелести выражение чьих-то глаз, потом же на колеблющемся, сером фоне постепенно проясняются контуры головы, лицо, брови, борода. Это он, суженый, предмет долгих мечтаний и надежд. Суженый для Нелли составляет все: смысл жизни, личное счастье, карьеру, судьбу. Вне его, как и на сером фоне, мрак, пустота, бессмыслица. И немудрено поэтому, что, видя перед собою красивую, кротко улыбающуюся голову, она чувствует наслаждение, невыразимо сладкий кошмар, который не передашь ни на словах, ни на бумаге. Далее она слышит его голос, видит, как живет с ним под одной кровлей, как ее жизнь постепенно сливается с его жизнью. На сером фоне бегут месяцы, годы... и Нелли отчетливо, во всех подробностях, видит свое будущее.

На сером фоне мелькают картина за картиной. Вот видит Нелли, как она в холодную зимнюю ночь стучится к уездному врачу Степану Лукичу. За воротами лениво и хрипло лает старый пес. В докторских окнах потемки. Кругом тишина.

— Ради бога... ради бога!— шепчет Нелли.

Но вот, наконец, скрипит калитка, и Нелли видит перед собой докторскую кухарку.

— Доктор дома?

— Спят-с...—шепчет кухарка в рукав, словно боясь разбудить своего барина.—Только-что с эпидемии приехали. Не велено будить-с.

Но Нелли не слышит кухарки. Отстранив ее рукой, она, как сумасшедшая, бежит в докторскую квартиру. Пробежав несколько темных и душных комнат, свалив на пути два-три стула, она, наконец, находит докторскую спальню. Степан Лукич лежит у себя в постели одетый, но без сюртука и, вытянув губы, дышит себе на ладонь. Около него слабо светит ночничок. Нелли, не говоря ни слова, садится на стул и начинает плакать. Плачет она горько, вздрагивая всем телом.

— Му... муж болен!—выговаривает она.

Степан Лукич молчит. Он медленно поднимается, подпирает голову кулаком и глядит на гостью сонными, неподвижными глазами.

— Муж болен!—продолжает Нелли, сдерживая рыдания.— Ради бога, поедемте... Скорее... как можно скорее!

— А?—мычит доктор, дуя на ладонь.

— Поедемте! И сию минуту! Иначе... иначе... страшно выговорить... Ради бога!

И бледная, измученная Нелли, глотая слезы и задыхаясь, начинает описывать доктору внезапную болезнь мужа и свой невыразимый страх. Страдания ее способны тронуть камень, но доктор глядит на нее, дует себе на ладонь и—ни с места.

— Завтра приеду...—бормочет он.

— Это невозможно! — пугается Нелли.—Я знаю, у мужа... тиф! Сейчас... сию минуту вы нужны!

— Я тово... только что приехал...—бормочет доктор.— Три дня на эпидемию ездил. И утомлен, и сам болен... Абсолютно не могу! Абсолютно! Я... я сам заразился... Вот!

И доктор сует к глазам Нелли максимальный термометр.

— Температура к сорока идет... Абсолютно не могу! Я... я даже сидеть не в состоянии. Простите: лягу...

Доктор ложится.

— Но я прошу вас, доктор!— стонет в отчаянии Нелли.— Умоляю! Помогите мне, ради бога. Соберите все ваши силы и поедемте... Я заплачу вам, доктор!

— Боже мой... да ведь я уже сказал вам! Ах!

Нелли вскакивает и нервно ходит по спальни. Ей хочется об'яснить доктору, втолковать... Думается ей, что если бы он знал, как дорог для нее муж и как она несчастна, то забыл бы и утомление, и свою болезнь. Но где взять красноречие?

— Поезжайте к земскому доктору...—слышит она голос Степана Лукича.

— Это невозможно!.. Он живет за двадцать пять верст отсюда, а время дорого. И лошадей не хватит: от нас сюда сорок верст, да отсюда к земскому доктору почти столько... Нет, это невозможно! Поедемте, Степан Лукич! Я подвига прошу. Ну, совершите вы подвиг! Сжальтесь!

— Чорт знает что... Тут жар... дурь в голове, а она не понимает. Не могу! Отстаньте.

— Но вы обязаны ехать! И не можете вы не ехать! Это эгоизм! Человек для ближнего должен жертвовать жизнью, а вы... вы отказываетесь поехать!.. Я в суд на вас подам!

Нелли чувствует, что говорит обидную и незаслуженную ложь, но для спасения мужа

она способна забыть и логику, и такт, и сострадание к людям... В ответ на ее угрозу доктор с жадностью выпивает стакан холодной воды. Нелли начинает опять умолять, взывать к состраданию, как самая последняя нищая... Наконец доктор сдается. Он медленно поднимается, отдувается, кряхтит и ищет свой сюртук.

— Вот он, сюртук!—помогает ему Нелли.—Позвольте, я его на вас надену... Вот так. Едемте. Я вам заплачу... Всю жизнь буду признательна... Но что за мука! Надевши сюртук, доктор опять ложится. Нелли поднимает его и тащит в переднюю... В передней долгая, мучительная возня с калошами, шубой... Пропала шапка... Но вот, наконец, Нелли сидит в экипаже. Возле нее доктор. Теперь остается только проехать сорок верст, и у ее мужа будет медицинская помощь. Над землей висит тьма; зги не видно... Дует холодный зимний ветер. Под колесами мерзлые кочки. Кучер то и дело останавливается и раздумывает, какой дорогой ехать...

Нелли и доктор всю дорогу молчат. Их трясет ужасно, но они не чувствуют ни холода, ни тряски.

— Гони! Гони!—просит Нелли кучера.

К пяти часам утра замученные лошади в'езжают во двор. Нелли видит знакомые ворота, колодец с журавлем, длинный ряд конюшен и сараев. Наконец она дома.

— Погодите, я сейчас...—говорит она Степану Лукичу, сажая его в столовой на диван.—Остыньте, а я пойду посмотрю, что с ним.

Вернувшись через минуту от мужа, Нелли застает доктора лежащим. Он лежит на диване и что-то бормочет.

— Пожалуйте доктор... Доктор!

— А? Спросите у Домны...—бормочет Степан Лукич.

— Что?

— На с'езде говорили... Власов говорил... Кого? Что?

И Нелли, к великому своему ужасу, видит, что у доктора такой же бред, как и у ее мужа. Что делать?

К земскому врачу!—решает она.

Засим следуют опять потемки, резкий, холодный ветер, мерзлые кочки. Страдает она и душою, и телом, и чтобы уплатить за эти страдания, у обманщицы-природы не хватит никаких средств, никаких обманов...

Видит далее она на сером фоне, как муж ее каждую весну ищет денег, чтобы уплатить проценты в банк, где заложено имение. Не спит он, не спит она, и оба до боли в мозгу думают, как-бы избежать визита судебного пристава.

Видит она детей. Тут вечный страх перед простудой, скарлатиной, дифтеритом, единицами, разлукой. Из пяти-шести карапузов наверное умрет один.

Серый фон не свободен от смертей. Оно и понятно. Муж и жена не могут умереть в одно время. Один из двух, во чтобы-то ни стало, должен пережить похороны другого. И Нелли видит, как умирает ее муж. Это страшное несчастье представляется ей во всех своих подробностях. Она видит гроб, свечи, дьячка и даже следы, которые оставил в передней гробовщик.

— К чему это? Для чего?—спрашивает она, тупо глядя в лицо мертвого мужа.

И вся предыдущая жизнь с мужем кажется ей только глупым, ненужным предисловием к этой смерти.

Что-то падает из рук Нелли и стучит о пол. Она вздрагивает, вскакивает и широко раскрывает глаза. Одно зеркало, видит она, лежит у ее ног, другое стоит попрежнему на столе. Она смотрится в зеркало и видит бледное, заплаканное лицо. Серого фона уже нет.

«Я, кажется, уснула...»—думает она, легко вздыхая.



На новагоднім бал-маскарадзе ў Мінскім Доме Чырвонай Арміі. Фото В. Грунтфеста

Загадчыца фермы

З 1939 года Беланава Лукер'я Васільеўна працуе на свінаферме сельскагаспадарчай арцелі «Ураджай», Забабскага сельсовета, Буда-Кашалеўскага раёна. Спачатку была даглядчыцай свіней. Працавала энергічна і мела добрыя поспехі ў рабоце. Група свіней, якіх яна даглядала, выдзялялася з усяго калгаснага стада. Прыплод маладняка з года ў год павялічваўся.

Як лепшага майстра свінагадоўлі, у 1939 годзе Лукер'ю Васільеўну праўленне калгаса вылучыла загадчыцай свінафермы. Адчуваючы вялікую адказнасць за даручаную справу, яна стала працаваць яшчэ больш старанна. Перабудоўваць работу на ферме пачала з устанаўлення моцнай працоўнай дысцыпліны даглядчыц. Склала графік работы. Стада свіней разбіла на групы. За дапамогай у наладжванні работы на ферме звярталася ў праўленне калгаса і да зоатэхнікаў раёна.

У 1939 годзе тав. Беланава ўдзельнічала ва Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы. Галоўвыстаўком узнагародзіў яе Малой сярэбранай медаллю.

— На Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы,—расказвае тав. Беланава,—я бачыла многа новага і цікавага, многаму навучылася, пераняла вопыт перадавых свінаводаў.

Прыехаўшы з выстаўкі, тав. Беланава правяла гутарку з даглядчыцамі свіней. Расказала ім аб усім, што давялося бачыць у цудоўным кутку Совецкай краіны. Бачанае на выстаўцы пачала прымяняць у сваім калгасе. У корм свіням стала дабаўляць чырвоную гліну, вугалле, падсмажаны ячмень. Звярнула вялікую ўвагу на санітарнае становішча фермы.

Зараз на свінаферме ў калгасе налічваецца 89 свіней (пры плане 80), з гэтага ліку 23 свінаматкі. На кожную з іх у 1940 годзе атрымана 19,5 дзелавых парасят. Увесь прыплод поўнасцю захаван.

Для свіней у калгасе пабудаван тыповы свінарнік. На зімовы перыяд ферма ў дастатковай колькасці забяспечана кармамі. Кармленне свіней праводзіцца тры разы ў суткі—у 6 гадзін раніцы, у 12 гадзін дня і ў 8 гадзін вечара. Пасля кармлення карыты вымываюцца гарачай вадой Два разы ў дзень—раніцай і вечарам—праводзіцца чыстка станкоў.

Загадчыца фермы тав. Беланава і ўсе работнікі ўзялі на сябе абавязацельства змагацца за далейшае павелічэнне калгаснага стада. Даглядчыца свіней Пелагея Беланава абавязалася дабіцца ад сваёй групы па 22 дзелавых парасяты прыплоду. Яны змагаюцца, каб у 1941 годзе зноў удастоіцца пачотнага права ўдзелу ва Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы.

Сцефаненка.

Буда-Кашалеўскі раён.

Лепшая стахаўка-цялятніца соўгаса імені Крупскай, Мінскага раёна, тав. Вашкевіч Антаніна Якаўлеўна з рэкордсменкай-каровай „Рабінай" і вырашчаным ад яе патомствам. Фота І. Рабіновіча.

РАСЦЕ КУЛЬТУРА ВЁСКІ

Вёска Круглянка была адной з адсталых, цёмных вёсак у былой Крэўскай воласці. Школы тут не было. Дзеці хадзілі за некалькі кіламетраў вучыцца, ды і ў тую школу не ўсіх прымалі. Многія не вучыліся. Амаль усе дарослыя былі непісьменныя. Ніякай культурнай работы ў вёсцы не праводзілася. Так было пры польскай уладзе.

За 15 месяцаў існавання совецкай улады вёска змяніла сваё аблічча. Тут адкрылі новую школу. Дзеці пайшлі вучыцца на сваёй роднай беларускай мове. За кароткі адрэзак часу вучні атрымалі ведаў больш, чым за некалькі год пры польскай уладзе.

У школе разгорнута мастацкая самадзейнасць. Нядаўна сіламі вучняў была пастаўлена інсцэніроўка, вучні дэклямавалі вершы. Бацькі з радасцю глядзелі на сваіх дзяцей.

Па ініцыятыве настаўніцы гэтай школы тав. Шмуклер у вёсцы арганізаван чырвоны куток. У час выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных у чырвоным кутку тав. Шмуклер праводзіла заняткі па вывучэнню Сталінскай Канстытуцыі. Сюды прыходзіла заўсёды больш 50 чалавек.

Рэгулярна тры разы ў тыдзень т. Шмуклер праводзіць палітінфармацыі, знаёміць насельніцтва з міжнародным становішчам. Часта адбываюцца гутаркі, чытка газет. Працоўныя з прагнасцю імкнуцца да вучобы, да ведаў.

Моладзь вёскі прымае актыўны ўдзел у гуртках мастацкай самадзейнасці. Сіламі членаў гуртка быў пастаўлен рад п'ес для выбаршчыкаў. Выязджалі таксама ў суседнія вёскі, дзе ставілі спектаклі.

Л. Леановіч

Смаргоньскі раён,
Вілейскай вобласці.

ДРУЖНАЯ РАБОТА

Я працую старшынёй калгаса імені Кагановіча пяць год. Хочацца падзяліцца вопытам работы і поспехамі калгаса. Асноўнае тое, што ў нас у калгасе моцная працоўная дысцыпліна. Ёсць у нас 76 чалавек працаздольных. Усе яны, як адзін, прымаюць удзел у рабоце. Часамі ў друку прыходзіцца чытаць артыкулы, у якіх гаворыцца аб дармаедах, лодырах у некаторых калгасах. Нашы калгаснікі і калгасніцы к такім фактам адносяцца з вялікім абурэннем. У нас лічыцца самым вялікім злачынствам нявыхад калгасніка без уважлівай прычыны на работу.

Летам, у часе ўборкі некаторыя жанчыны з грудзімі рэбятамі не мелі магчымасці працаваць на палявых работах. Мы з гэтага становішча вельмі хутка вышлі: арганізавалі яслі. Мацеры былі вельмі задаволены імі.

Калгаснікі ганарацца сваімі перадавымі людзьмі, якіх урад адзначыў за стаханаўскую работу ўзнагародамі. Вось Марыя Варошка ўзнагароджана медаллю «За трудовую доблесть», Марыя Таран—«За трудовое отличие». Срэбранымі Малымі медалямі ўзнагароджаны ўдзельніцы Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі Наташа Ханяк і Соф'я Варошка. Пяцідзесяцігадовая звеннявая Марковіч з'яўляецца стаханаўкай. Добра кіруе сваёй брыгадай Пелагея Таран і другія.

У калгасе зараз арганізавана пяць ферм: коней, рагатай жывёлы, свіней, авечак і птушак. Развіццё жывёлагадоўлі таксама праходзіць у нас пры агульных намаганнях калгаснікаў. У складанні і абмеркаванні баланса кармоў для жывёлы калгаснікі прымаюць самы гарачы ўдзел. Кожны па-гаспадарску ўносіць прапанову, як лепш арганізаваць справу, каб жывёла была добра дагледжана і накормлена. Мы таксама маем 27 вулляў пчол.

Нашы калгаснікі жывуць заможна і культурна. Сярэдняя сям'я ў калгасе атрымае больш тоны зернавых, каля 10 тон бульбы на працадні. Ранняй вясной мы будзем праводзіць зялёнае насаджэнне вакол калгасных сядзіб. Для гэтага ў нас ёсць гадавальнік пладовых дрэў.

Нашы калгаснікі ўмеюць не толькі па-стаханаўску працаваць, але культурна і весела адпачываць. Сіламі моладзі калгаса і школы праводзяцца вечары самадзейнасці, ставяцца спектаклі. Часта праводзім сходы калгаснікаў па пытаннях міжнароднага і ўнутранага становішча.

Першыя годы маёй работы старшынёй калгаса былі цяжкаватымі, але мне многа дапамаглі мясцовыя партыйныя і совецкія арганізацыі. Зараз я адчуваю, што магу самастойна вырашаць многія пытанні па гаспадарцы арцелі. Выросла і палітычна, займаюся самаадукацыяй. Вялікую ўвагу ўдзяляю грамадскай рабоце. З'яўляюся дэпутатам райсовета і сельскага Совета дэпутатаў працоўных.

У 1941 годзе будзем яшчэ больш змагацца за новыя поспехі ў падняцці ўраджайнасці. Спадзяюся, што з задачамі, пастаўленымі партыяй і ўрадам перад калгасамі, мы справімся. Залог гэтага—дружная стаханаўская работа ўсіх калгаснікаў і калгасніц.

Ладзік, старшыня калгаса імені Кагановіча.
Лепельскі раён.

МАЦЕРЫ СПАКОЙНЫ ЗА ДЗЯЦЕЙ

Многа новага прынёс прайшоўшы год асабліва нам—жанчынам заходніх абласцей Беларусі. Для жанчын і дзяцей у нас

У малочнай кухні г. Брэста.
На здымку: Медсястра І. Ф. Навасельская (злева) і У. С. Арановіч за разліўкай стравы.
Фото Лупейка.

створаны такія ўстановы, аб якіх раней яны і марыць не маглі. Я маю на ўвазе створаную шырокую сетку ўстаноў па ахове мацярынства і дзяцінства.

Жанчына-маці можа цяпер спакойна працаваць, ведаючы, што яе дзіця дагледжана. Узяць для прыкладу Брэст. Пры гаспадараннi польскіх паноў дзеці працоўных тут былі пакінуты на волю лёсу. Цяпер, дзякуючы клопатам совецкай улады, лепшыя будынкі горада адданы для дзіцячых садоў, ясляў і іншых бытавых устаноў.

У 1940 годзе на ахову мацярынства і дзяцінства па гораду выдаткавана 550 тысяч рублёў. Якая гэта пераканаўчая лічба! У нас створаны яслі, малочная дзіцячая кухня, якая дае да 20 тысяч порцый малака, кіселя, розных адвараў у месяц для дзяцей. Створаны ў нас дзіцячая і жаночая кансультацыі. У кансультацыі жанчына-маці атрымоўвае не толькі медыцынскую дапамогу, але і карысныя парады па выхаванню рэбят.

Хочацца адзначыць і яшчэ адно мерапрыемства, якое сведчыць аб велізарных клопатах совецкай улады аб мацерах і дзецях. Гэта датычыцца выдачы дапамогі мацерам па многасямейнасці. У гэтым годзе многасямейныя Брэста таксама, як і многасямейныя астатніх заходніх абласцей БССР, атрымалі дзяржаўную дапамогу. Многадзетныя мацеры тт. Андрэлевіч, Флейшэр, Піво і інш. атрымалі каля 20 тысяч рублёў. Радасці іх не было канца.

Совецкая ўлада прынесла жанчынам вызваленай зямлі шчасліваe жыццё. І ўступаючы ў новы год, мы ведаем, што ён будзе яшчэ лепшым, яшчэ больш пладатворным.

Штэйнберг, інспектар аховы мацярынства і дзяцінства.
Брэст.

Жанчына ў беларускай народнай творчасці

Пад гэтым загалоўкам вышаў нядаўна з друку зборнік народных песень, казак і былін пад рэдакцыяй акадэміка Н. М. Нікольскага і М. Я. Грынблата. Жывое народнае слова, глыбокае пачуццё, праўдзівая думка—характэрны для кожнай песні, кожнага твору гэтага зборніка.

Мінулая доля беларускай працоўнай жанчыны паказана ў яркіх паэтычных вобразах, у песнях, поўных глыбокага смутку і гора.

Цяжкое, дарэволюцыйнае жыццё праўдзіва паказана ў творах, складзеных самім народам—батрачкамі, пастухамі, работніцамі, якія ад цямна да цямна рабілі на праклятага пана. Гора, голад і бяда хадзілі за працоўнай жанчынай ад калыскі да самай магілы:

Парадзіла мяне мамачка
Ды ў святую нядзелю,
Благаславіла горкую долю,—
Дзе яе падзену?

Вось павяду горкую долю,
У цёмным лесе кіну,
Сама прыду ды на ганачак,
Стану паслухаю.
А што ў лесе, цёмным лесе
Там нехта гукае,
Ажно мяне горкая доля
У цёмным лесе шукае.

На полі, за кудзеляй, на вяселлі і ля труны любімага чалавека, — спяваліся журботныя, простыя песні, якія з пераканаўчай сілай паказвалі ўсю трагедыю жыцця працоўнай жанчыны пры капіталізме.

Вось, напрыклад, маладая жанчына звярталася да маці перад ад'ездам у чужую сям'ю:

Мая мамачка, заставайся здарова,
Жыві багата,
Не забывайся на мяне, маладую;
Калі буду жабраваці,
Варотца адчыняйце,
Хоць па кусочку хлеба давайце.

Кожнае дзіця, народжанае да рэволюцыі ў беднай сям'і, аплаквалася бацькамі горкімі слязьмі. Недарма хадзілі ў народзе такія прыказкі: «Дзетак гадаваць, век гараваць», «Дзяцей, як бобу, а хлеба ні дробу», «Ой дзеці, дзеці куды вас падзеці?», «Дзеткі, не будзьце едкі, ды не з'ежце бацьку ў лапцях».

Жанчына на кожным кроку цяжка перажывала сваё няроўнапраўе ў грамадстве і ў сям'і. У старой песні, запісанай яшчэ ў 1886 годзе ў Слуцкім павеце, ёсць такія горкія словы праўды:

Чалавек жонку б'е, бічуе,
А ніхто-ж яе не ратуе.
— Свёкар мой, баценька, родненькі,
Пашкадуй мяне, маладзеньку.
А свёкар падбягае
Ды нагаечку паднімае:
— Бі, сынок, бі,
Дурную бабу бі,
Бі, навучай,
На свой звычай,
Пераварачай!

Пра жанчыну гаварылася: «бабе дарога—ад печы да парога», «Хто жаны не б'ець, той і домам не жывець».

Але ў народных прыказках, жніўных і вясельных спевах, у народных казках жыла вялікая нянавісць да паноў і ўставаў заклік да змагання за вольнае, справядлівае жыццё. Асабліва моцным і хвалюючым з'яўляецца твор «Каб аб пану ўспаміну не было». Сялянка ідзе да крутой рэчкі і склікае за сабой шэрых ваўкоў:

Вы запейце песню страшнае таскі,
Разарвіце цела пана на кускі,
Разарвіце, закапайце за сялом
Каб аб пану ўспаміну не было.
На тым месцы, дзе закапаны быў пан,
Расці будзе палын горкі і бур'ян.

У простай, мудрай казцы «Як дзве сястры шчасце знайшлі» яскрава паказана рэволюцыйная барацьба рабочых і сялян за сваё вызваленне ад цара і капіталістаў.

Радасцю светлай прасякнута заключная частка гэтай казкі: «Знайшлі сабе шчасце дзве родныя сястры. Яны сталі найшчаслівейшымі ў свеце. Як птушкі, яны лётаюць вышэй лясоў і хмар, быстрэй сокала і буры, вышэй гор-небаскробаў. На фабрыках, на складаных машынах працуюць, сваёй роднай краінай кіруюць. Заглянула ім ясна сонца ў аконца».

Сардэчная любоў і падзяка да вялікіх правадыроў Леніна і Сталіна выражана ў новых, цудоўных паэтычных песнях, складзеных совецкімі жанчынамі.

«Пра што некалі снілі, сёння зрабілі»,—так гаворыць новая прыказка.

Ой, ляці, ляці ты ўвысь,
Птушачка крылатая.
Дзякуй, родны, мудры Сталін,
За жыццё багатае.

Надзвычай свежымі, сакавітымі вобразамі прасякнуты народныя творы аб жыцці ў калгасе, аб свабоднай працы, аб новай сям'і і новых чалавечых адносінах. Шчаслівая маці спявае калыханку:

Спі, дачушка мая Валя,
І равеснік твой Віталій,
Вас-жа любіць мудры Сталін.
Хачу, каб вы падрасталі,
Перад вамі шчасця далі,
Вас-жа любіць мудры Сталін.

Совецкая маці ўпэўнена глядзіць у ясную будучыню свайго дзіцяці.

Выдатным мастацкім творам з'яўляецца сказ «Раскажыце Сталіну пра мяне». Сямідзесяцігадовая калгасніца гаворыць аб сваёй радасці жыць на свеце. Яна звяртаецца да смерці:

— Не йдзі, не йдзі ў маю хату, смерць,
У маёй хаце некуды цябе дзець.
Убірайся, лютая, са двара,
Мне, старой, не хочацца паміраць.
Са сваімі дзеткамі хочу быць,
Са сваімі роднымі хочу жыць.

У зборніку ёсць песні пра Вялікі дзень 17 верасня 1939 года, калі Беларусь Заходняя аб'едналася з Беларуссю Усходняй.

Верасень месяц,
Семнаццаты дзень
Зняў з нас навекі
Смутак і цень.
Словамі не ў сілах
Мне апісаць,
Як нам цяпер міла
„Таварыш" сказаць.

Так гаворыць Ніна Крэмко, сялянка з вёскі Жуковы Барок Стаўбцоўскага раёна. З ёй пераклікаюцца звонкія галасы дзяўчат з вёскі Карацькова:

Стала весела нам жыць,
Рады мы бясконца,
Жыццё наша асвяціла
Сталінскае сонца.

Зборнік «Жанчына ў беларускай народнай творчасці» з'яўляецца жывой крыніцай народнай паэзіі, паказвае проста і праўдзіва шлях працоўнай жанчыны, якая стала роўнапраўным чалавекам; навекі прагнала цемру мінулага і вясёла спявае:

Хай-жа мая песня
Па свету нясецца,—
Усяму свету раскажу,
Як добра жывецца.

Эдзі Агняцвет

Инв. 1958 г. 64666

Аб шкодзе алкаголя

Алкаголь з старадаўніх часоў лічыўся адной з важных прычын многіх хвароб. Тая акалічнасць, што алкаголь, ужываемы ва ўмераных дозах павышае настрой, дае добрае самаадчуванне і ўзбуджае нервовую сістэму, заўсёды падтрымлівала імкненне людзей да ўжывання спіртных напіткаў. Алкаголь перш за ўсё—нервовы яд. Пры працяглым ужыванні, нават у невялікіх дозах, ён павольна, але верна атручвае клеткі арганізма.

Часова падсцёгваючы нервовую сістэму, сродак гэты спрадвеку атрымаў значэнне падмацоўваючага, стымулюючага. Вядомы фізіёлаг Сечэнаў гаварыў, што беспрасветная, аднастайная, манатонная праца рабочага таго часу патрабавала ўзбуджальніка для нервовай сістэмы: у першым перыядзе стамлення дапамагала песня, а потым ужо з'яўлялася патрэба ў алкаголі.

У людзей, хранічна атручаных алкаголем, многія хваробы прымаюць больш цяжкую форму. Ёсць і такія хваробы, якія выклікаюцца самім алкаголем. Да апошніх адносіцца цэлы рад хвароб з боку цэнтральнай нервовай сістэмы і псіхікі, напрыклад множны алкагольны параліч перыферычных нерваў (полінеўрыт). Другая хвароба—дрыжальны брэд алкаголікаў, ці белая гарачка—вядома ўсякаму. Эпілепсія ці падучая хвароба ў 30 процантах выпадкаў наглядаецца і праяўляецца пры алкагалізме, і самае страшнае тое, што яна перадаецца па спадчыне ні ў чым нявінным дзецям.

Алкагалізм выклікае цэлы рад душэўных расстройстваў. Маюцца некаторыя адзнакі так званага скрытага алкагалізма, калі ў органах хворага яшчэ няма рэзкіх паражэнняў, выкліканых гэтай атрутай, а толькі сімптомы асаблівага раздражэння з боку нервовай сістэмы. Такія хворыя ўспрыймальныя да многіх інфекцый, асабліва да туберкулёза. У гэтых людзей і звычайныя хваробы працякаюць звычайна цяжэй (напрыклад запаленне лёгкіх), таму што іх аслабленая нервовая сістэма страчвае свае нармальныя рэгулятарныя функцыі і супраціўленне да хвароб рэзка паніжана.

Думка аб тым, што алкаголь узбуджае апетыт, вельмі распаўсюджана. На жаль, многія ўрачы таксама прытрымліваюцца такога погляду.

Усе гэтыя размовы ў корані шкодны і няправільны.

Пры алкагалізме рана з'яўляюцца непарадкі з боку органаў страваварэння. Гэта з'ява так званай дыспепсіі. Яна выяўляецца ў моцнай смазе, цяжкасці пад лыжачкай і нават у прыступе болей з ванітамі і зрыгванні кіслай вадкасці.

Алкаголь дзейнічае ў першую чаргу на страўнік, асабліва ў людзей, якія п'юць водку, не глытаючы, закідваючы галаву і выпрамляючы страваход. Слізістая абалочка страўніка адразу атрымлівае апёк спіртам. У рэзультаце працяглага раздражнення ўзнікаюць хранічныя катары страўніка. Гэтыя катары, нарэшце, вядуць да атрафіі слізістай абалочкі і глыбока расстройваюць усё страваварэнне.

Вельмі часта алкаголь выклікае жаўтуху. Востры катар страўніка захоплівае дванаццаціперсную кішку, у якую увахо-дзіць праток печані. Раздражненне паднімаецца вышэй, у жоўчныя шляхі, яны набухаюць, адток жоўчы затрудняецца, пачынаецца жаўтуха. У хворага з'яўляецца слабасць, страта апетыта, зуд скуры. Жаўтуха можа прыняць цяжкую форму і іншы раз канчаецца смерцю. Запаленне страўніка і жаўтуха часта залежаць таксама і ад таго, што выпіўка звычайна суправаджаецца багатай закускай. Кансервы, каўбаса, рыба пры нявумераным ужыванні садзейнічаюць захворванню органаў страваварэння.

Запаленне страўніка пры працяглым цячэнні нярэдка падрыхтоўвае спрыяючую глебу для такіх сур'ёзных хвароб, як язва і рак страўніка.

Другі орган, на які разбураюча ўплывае алкаголь,—гэта печань. У рэзультаце дрэннага страваварэння печань прымае на сябе раздражняльныя ўдары з страўніка і кішэчніка праз сістэму варотнай вены, якая збірае ўсю венозную кроў з страваварыцельных органаў і праводзіць яе праз печань. Печань хутка павялічваецца. Паступова ў ёй пачынае раздражняцца злучальная тканіна, печань зморшчваецца, пячоначныя клеткі гінуць, варотны крывезварот здаўліваецца. З'яўляецца вадзянка жывата: жывот моцна павялічваецца ў аб'ёме, у той час як сам хворы моцна худзее. Часта ў такіх хворых бывае насавое крывецячэнне, а іншы раз і вялікія страўнікавыя крывецячэнні.

З хвароб дыхальных органаў асабліва цяжка праходзіць у алкаголікаў туберкулёз і запаленне лёгкіх. Пад уплывам алкаголя іншы раз у хворага ўзнікаюць прыступы серцабіення. Спірт схіляе да затрымкі абмена матэрый, ажырэнню і ранняму склерозу. Пад уплывам часта наступаючых серцабіенняў і ажырэння харчаванне сэрца нарушаецца. У хворых развіваецца паражэнне мышцы сэрца, так званыя міокардзіты з усімі іх цяжкімі вынікамі. На хваробы сэрца, акрамя алкаголя, уплывае ўвядзенне велізарнай колькасці вадкасці, напрыклад піва, сітро і вінаграднага віна, у выніку чаго сэрца пашыраецца. Асабліва часта артэрыосклероз развіваецца ў тлустых алкаголікаў, якія аб'ядаюцца тлустай стравай.

У нашай совецкай краіне, дзе так радасна праца і прыгожа жыццё, дзе навука карыстаецца павагай і аўтарытэтам, дзе працвітае мастацтва і талент, барацьба з алкагалізмам не прадстаўляе такіх цяжкасцяў як у краінах капіталістычнага свету. У гэтай барацьбе вялікую актыўную ролю павінна адыграць наша моладзь, памятаючы, што алкагалізм—гэта пастаянны спадарожнік бытавога і маральнага разлажэння.

Заслужаны дзеяч навукі прафесар М. П. Канчалоўскі.

„Работніца".

Инв. 1358 Б 64666

Адказны рэдактар Г. В. КАГАН

Адрас рэдакцыі: Мінск, Совецкая, 49, 2 паверх, комната № 4. Тэл. 24058

Друкарня імя Сталіна. Зак. № 3060. Тыраж 13.000 экз. У-1493.
Здана ў друк. 29/XII—40 г. Падпісана да друку 14/I—41 г. У нумары 2½ друк. арк. 120.140 друк. знак.

3903

ЦЕНА 20 КАП.